Любое месца, дзе засталіся сляды

П'еса складаецца з 11 дзей: 32 старонкі.
У Дадатку (5 старонак) пераклады на беларускую мову дзвюх дзей, якія напісаныя на іншых мовах.

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ

ГАСПАДЫНЯ
ЖАНЧЫНА
НАЗІРАЛЬНІЦА

ВЫПАДКОВЫ

МАДЭРАТАР
ЖУРНАЛІСТ/КА 1
ЖУРНАЛІСТ/КА 2
ЖУРНАЛІСТ/КА 3
ЖУРНАЛІСТ/КА 4

СЯБАР
СЯБРОЎКА
ЗНАЁМЫ

ЁН	малады мужчына, які ведае беларускую мову
ЯНА	маладая жанчына, якая ведае беларускую мову

АПЕРАТАР

БЕЛАРУС	мужчына, які ведае беларускую мову
ЯЎРЭЙ	мужчына, які ведае іўрыт
УКРАІНКА	жанчына, якая ведае ўкраінскую мову

ДОКТАР
МАЦІ

АКТ 1
ДЗЕЯ 1

Жанчына ў пакоі: паўцёмным, утульным. З цемры дзвярнога праёму выходзіць Гаспадыня. У куце каля акна стаіць яшчэ адна жанчына - Назіральніца - яна амаль зліваецца са сцяной, глядзіць у акно.

ГАСПАДЫНЯ Хочаце чаго-небудзь? Гарбаты?

ЖАНЧЫНА Я? Не, я… Не, дзякуй, нічога, напэўна.

ГАСПАДЫНЯ Вы сядайце! Мо кавы? У мяне распушчальная, праўда.

ЖАНЧЫНА Я, напэўна, не, напэўна.

ГАСПАДЫНЯ У мяне й віно ёсць. Добрае! Абаронены геаграфічны знак. Хочаце? Адзін келіх?

ЖАНЧЫНА Напэўна, я… Напэўна, гарбату, калі ласка.

ГАСПАДЫНЯ (*прыязна ўсміхаецца*) Не любіце абіраць? Адкуль вы?

Аддалены гук выбуху.

ГАСПАДЫНЯ Пробкі павыбівала.

ЖАНЧЫНА Святло ж працуе?

ГАСПАДЫНЯ Ммм, гэта ў суседзяў. Дык што, віна, так?

ЖАНЧЫНА Каву, калі можна.

ГАСПАДЫНЯ Ну глядзіце, мая справа прапанаваць. Хвіліначку, вы тут пасядзіце пакуль што.

Гаспадыня сыходзіць. Жанчына азіраецца. Чуваць гул вуліцы. Жанчына падымаецца і ідзе да акна. Гаспадыня заходзіць з гарбатай, ставіць чайнік і кубкі на стол. Жанчына вяртаецца і сядае.

ГАСПАДЫНЯ Вы змерзлі? Я закрыю (*закрывае акно*).

ЖАНЧЫНА Не, усё ў парадку. Нават крыху горача.

ГАСПАДЫНЯ Папіце гарбаты, сагрэйцеся.

Гаспадыня метадычна разлівае гарбату. Назіральніца ўздыхае. Жанчына і Гаспадыня моўчкі п'юць гарбату.

ЖАНЧЫНА У вас вельмі прыгожы дом.

ГАСПАДЫНЯ Ох, дзякуй! Ну які ўжо дом, кватэра, хрушчоўка, ну які ёсць дом, так. Але мы неяк намагаліся ўладкаваць, каб больш утульна было, ведаеце. Ведаеце, я калі сюды прыехала, тут нічога не было і, ведаеце, усё страшна смярдзела. І туалет, ох... І я дастала дзесьці мыйныя сродкі - а з імі цяжка было, не было іх, мала было, і я іх у бутэльцы разбавіла і памыла тут усё, так. Прыбралася. Я вось так адчуваю, быццам я кантралюю сваё жыццё. (*смяецца*) А як мы спявалі!

НАЗІРАЛЬНІЦА Цішэй.

ЖАНЧЫНА (*да Назіральніцы*) Вы кагосьці чакаеце?

НАЗІРАЛЬНІЦА (*шыпіць*) Цішэй!

Гук: адчыняюцца ўваходныя дзверы, нехта заходзіць, распранаецца, здымае боты. Сыходзіць углыб кватэры.

ЖАНЧЫНА Вы не пойдзеце сустракаць?

ГАСПАДЫНЯ (*адмахваецца*) Гэта ў суседзяў. Мо вы прылегчы хочаце?

ЖАНЧЫНА Шчыра кажучы... Я разумею, як гэта гучыць, але, ведаеце, я не памятаю, як тут апынулася.

ГАСПАДЫНЯ А што вы памятаеце?

ЖАНЧЫНА (*азіраецца на калідор*) Там дакладна нікога няма?

ГАСПАДЫНЯ Ды няма там нікога.

ЖАНЧЫНА Ніхто зараз не заходзіў?

ГАСПАДЫНЯ Я не заўважыла. Вы пачыналі расказваць, што вы памятаеце.

ЖАНЧЫНА Так…

ГАСПАДЫНЯ Вы гарбатку піце.

ЖАНЧЫНА Так, дзякуй, вельмі смачна.

ГАСПАДЫНЯ Ну, не адцягвайце ўвагу.

ЖАНЧЫНА Ад чаго?

ГАСПАДЫНЯ Вы нешта распавядалі.

ЖАНЧЫНА А, так. (*сёрбае гарбату*) Я толькі памятаю, што было шмат людзей.

ГАСПАДЫНЯ (*усміхаецца*) Гарадскія святы, так іх люблю.

ЖАНЧЫНА І яны ішлі.

ГАСПАДЫНЯ Як цудоўна. І вы таксама ішлі?

ЖАНЧЫНА І я ішла.

ГАСПАДЫНЯ (*усміхаецца*) Цудоўна.

ЖАНЧЫНА Потым на прыпынку спынілася.

ГАСПАДЫНЯ (*смяецца*) Ну што ж, цалкам лагічна.

ЖАНЧЫНА А дзяўчына каля мяне праходзіла і прапанавала мяне ўзяць кветку.

ГАСПАДЫНЯ (*усміхаецца*) Мусіць, вам было дужа прыемна.

ЖАНЧЫНА Я адмовілася.

ГАСПАДЫНЯ Глупства нейкае, адмаўляцца. Як няветліва.

ЖАНЧЫНА Так… Але я хацела, каб рукі былі вольныя.

ГАСПАДЫНЯ Чым жа такім яны ў вас былі занятыя?

ЖАНЧЫНА Здаецца, нічым...

ГАСПАДЫНЯ Навошта тады адмаўляцца?

НАЗІРАЛЬНІЦА Каб можна было хутчэй бегчы.

ГАСПАДЫНЯ На прыпынку?

ЖАНЧЫНА Не, на прыпынку было нармальна, мы стаялі... А потым пачалі крычаць...

Голас зверху «Хопіць крычаць! Я зараз міліцыю на вас паклічу! Колькі можна шумець!»

ГАСПАДЫНЯ (*усміхаецца*) Суседзі. Дык што, нехта закрычаў?

НАЗІРАЛЬНІЦА (*шыпіць*) Цішэй!

ГАСПАДЫНЯ Дык што вы крычалі?

НАЗІРАЛЬНІЦА Не трэба крычаць!

Зноў чуваць крокі. Адчыняюцца ўваходныя дзверы, нехта выходзіць.

ЖАНЧЫНА Там нехта заходзіў, усё ж...

ГАСПАДЫНЯ (*усміхаецца*) Гэта ў суседзяў, што ж вы так непакоіцеся. Вы гарбату піце і кажыце.

НАЗІРАЛЬНІЦА Толькі крычаць не варта.

ГАСПАДЫНЯ Правільна, лепей толькі гарбату піце! Ха-ха, жартую, жартую.

ЖАНЧЫНА Так. Не. Там быў не зусім крык. Хутчэй... Я памятаю, хутчэй, адчуванне... Тут зусім няма чым дыхаць, мо ўсё ж адчынім акно?

Гаспадыня падыходзіць да акна, адчыняе: з вуліцы чуваць гул чалавечай масы. Голас зверху: «Ці вы супакоіцеся ўжо, дэбілы! Ідыёты, колькі можна! Я зараз міліцыю паклічу!» Гаспадыня зачыняе акно, падыходзіць да стала, налівае сабе кубак гарбаты.

ГАСПАДЫНЯ Ух, я ўся празябла. (*да Жанчыны*) Мо яшчэ гарбаты?

ЖАНЧЫНА Не, дзякуй. Я гэтую яшчэ не выпіла.

ГАСПАДЫНЯ Што ж вы не п'яце?

ЖАНЧЫНА (*сёрбае*) Ды неяк...

ГАСПАДЫНЯ Можа вам іншай прынесці? У мяне ёсць.

ЖАНЧЫНА Не трэба, шчыры дзякуй! (*сёрбае*) Гэтая файная.

ГАСПАДЫНЯ У мяне ёсць іншая. Чырвоная ёсць. Ёсць нейкая нават... цікавая! (*хітра ўсміхаецца*)

ЖАНЧЫНА Не трэба, дзякуй. Я вам шчыра ўдзячная за гасціннасць.

ГАСПАДЫНЯ Малочны ўлун! Ёсць малочны ўлун! Вось, прыгадала. Толькі няма малака.

ЖАНЧЫНА Для яго не патрэбнае малако.

ГАСПАДЫНЯ Ой, дык вы пра яго ведаеце? Ён ў мяне ўсё ляжыць, як перадалі мне аднекуль з-за мяжы, але ж я яго так ніколі і не гатавала. Давайце, яшчэ чайнік закіпячу і мы вам яго тады й прыгатуем.

ЖАНЧЫНА Не трэба, дзякуй, я не вельмі люблю такі.

ГАСПАДЫНЯ (*усміхаецца з каліўцам раздражнення*) Ну нават не ведаю, неяк вам не дагадзіць.

ЖАНЧЫНА Што вы, я зусім не хацела вам рабіць нязручна. Шчыры вам дзякуй за гарбату, і за тое, што далі прытулак. Проста я зусім не памятаю, як я...

НАЗІРАЛЬНІЦА Цішэй!

У калідоры пад'езда чуваць крокі, некалькі чалавек. Галасы сцішаныя, людзі быццам спрачаюцца аб нечым. Гук удару – быццам нехта ўдарыў палкай па меху бульбы. Нягучны стогн.

ЖАНЧЫНА Ды што там адбываецца!

НАЗІРАЛЬНІЦА Цішэй!

Гукі ўдараў паўтараюцца. Чуваць нягучны стогн. Гукі ўдараў паўтараюцца яшчэ некалькі разоў – ужо ў цішыні.

ЖАНЧЫНА Мабыць там дапамагчы камусьці трэба?

ГАСПАДЫНЯ Гэта ў суседзяў. Дык што, яшчэ гарбаты?

Жанчына ўстае з крэсла, накіроўваецца ў бок дзвярэй. Гаспадыня ўскаквае, загароджвае сабой шлях.

НАЗІРАЛЬНІЦА Цішэй!

ГАСПАДЫНЯ Гэта ў суседзяў. Навошта вы туды сунецеся? (*усміхаецца*) Чырвонай? З малінкай?

ЖАНЧЫНА Мабыць там некаму дапамога патрэбная?

ГАСПАДЫНЯ Можа кавы? У мяне ёсць 3-ў-1.

ЖАНЧЫНА Там гук такі быў, быццам... Быццам...

НАЗІРАЛЬНІЦА Ага.

ГАСПАДЫНЯ Сядайце на месца. Адчувайце сябе як дома, але памятайце, што вы ў гасцях (*смяецца*).

НАЗІРАЛЬНІЦА (*смяецца*) Гэта ўсё жах, тут проста суцэльны жах.

ЖАНЧЫНА Чаму ж вы не пойдзеце адсюль?

НАЗІРАЛЬНІЦА (*паварочваецца, паказвае, што адна яе рука прыкаваная да батарэі*) Чаму вы вырашылі, што я хачу?

ГАСПАДЫНЯ Вось толькі не думайце, што гэта я яе тут утрымліваю! У яе ў іншай руцэ ключ, яна сама так хоча, стаіць сабе і стаіць там. Стаіць і назірае за тым, што там адбываецца.

ЖАНЧЫНА А што там адбываецца?

ГАСПАДЫНЯ (*паціскае плячыма*) Несправядлівасць. Ну што, нясу віно?

ЖАНЧЫНА (*да Назіральніцы*) Якая карысць ад таго, што вы гледзіце?

НАЗІРАЛЬНІЦА А якая карысць ад таго, што вы?

У калідоры пад'езда чуваць крокі. Некалькі ўдараў быццам па меху бульбы, чуваць некалькі стогнаў. Усё сціхае.

ЖАНЧЫНА (*імкнецца ісці ў калідор*) Ды што там адбываецца?

НАЗІРАЛЬНІЦА Цішэй!
ГАСПАДЫНЯ Я ж вам казала!

ЖАНЧЫНА Але там жа...

НАЗІРАЛЬНІЦА Ну так.

ЖАНЧЫНА За што?

ГАСПАДЫНЯ Ну вы ж разумееце.

ЖАНЧЫНА Нічога я не разумею!

ГАСПАДЫНЯ А хто вы такая, каб разумець?

ЖАНЧЫНА А хто я такая? Я ж казала вам, я не памятаю...

НАЗІРАЛЬНІЦА Была дзяўчынка і няма яе, дый не было яе ўвогуле.

Аддалены гук выбуху.

ЖАНЧЫНА Гэта ў суседзяў? Пробкі?

ГАСПАДЫНЯ Вядома.

У калідоры чуваць крокі. Гук удару, потым яшчэ некалькі, паступова пераходзіць у апладысменты.

ГАСПАДЫНЯ Трэба чайнік уключыць, каб кіпяціўся.

ЖАНЧЫНА Ведаеце, я пайду, напэўна, дзякуй вам за...

ГАСПАДЫНЯ Куды ж вы пойдзеце? Ноч на вуліцы!

ЖАНЧЫНА (*да Назіральніцы*) Хіба ноч?

НАЗІРАЛЬНІЦА А вы з якой мэтай цікавіцеся?

ГАСПАДЫНЯ Вы паводзіце сябе як вельмі нявыхаваны чалавек. Няветлівы.

ЖАНЧЫНА Я не разумею нічога з таго, што тут адбываецца...

ГАСПАДЫНЯ Хіба вас мама не вучыла, што нельга лезці ў чужое жыццё?

ЖАНЧЫНА Да чаго тут...

ГАСПАДЫНЯ Гэта ўсё нявыхаванасць. Вы, моладзь, лічыце, што вы ўсё ведаеце і разумееце. А я вам скажу, што гэта ўсё лухта. Хіба вам кепска жывецца?

ЖАНЧЫНА Але ж...

ГАСПАДЫНЯ Вам цёпла, вам суха. Гарбата ў вас ёсць цёплая. Зараз во яшчэ печыва прынясу – чаго вам яшчэ трэба?

ЖАНЧЫНА Прабачце, калі ласка, я не хацела вас пакрыўдзіць. Але я...

ГАСПАДЫНЯ Але вы вельмі непрыгожа сябе паводзіце. Я да вас з усёй душою, я вас пусціла, але ж магла й не пускаць, я пра вас паклапацілася, а вы мне чым аддзячылі?

ЖАНЧЫНА Даруйце, мне трэба ісці.

НАЗІРАЛЬНІЦА Куды?

ГАСПАДЫНЯ Вы ж мяне падставіце, калі сыдзеце!

ЖАНЧЫНА Божа, ды чаму?

ГАСПАДЫНЯ Вы ж мне лёс зломіце!

ЖАНЧЫНА (*паказвае на сцяну, з-за якой чуваць гукі*) Ды што ж там адбываецца?

НАЗІРАЛЬНІЦА Цішэй!

Жанчыны сціхаюць. Чуваць гукі ўдараў. Голас зверху «Ці вы калі-небудзь забіце зяпу! Вы дасце мне пажыць у спакоі?! Я зараз міліцыю паклічу!»

ЖАНЧЫНА Гэта нейкі піздзец.

НАЗІРАЛЬНІЦА Вам варта навучыцца ёга-дыханню. Вы галоўнае дыхайце правільна: уздых – выдых. Уздых – выдых.

Назіральніца і Гаспадыня пачынаюць сінхронна дыхаць. Гукі ўдараў не спыняюцца.

ЖАНЧЫНА (*падымаецца і накіроўваецца да дзвярэй*) Гэта піздзец. Гэта поўны піздзец.

Жанчына моцна штурхае ад сябе дзверы і выходзіць у цёмны калідор.

ДЗЕЯ 2

Цішыня. Цемра. Жанчына вельмі павольна, навобмацак пачынае ісці наперад. Яна натыкаецца нагой на кагосьці, і яе рэзка цягнуць уніз: Жанчына прысядае.

ВЫПАДКОВЫ Цсс!

Жанчына сядзіць, моцна прыціснутая да Выпадковага. Па сцяне над імі праходзіць прамень святла ад фар машыны, што праехала недалёка: прамень вымалёўвае цень чалавека. Чалавек стаіць недзе побач.

Навокал зноў цёмна. Гравій пад нагамі: чуваць, як чалавек зверху крок за крокам адыходзіць далей. Жанчына кранае Выпадковага за рукаў.

ЖАНЧЫНА (*вельмі ціхім шэптам*) Сышоў?
ВЫПАДКОВЫ Не ведаю.

На сцяне зноў высвечваюцца фары. Цень чалавека цяпер не відаць.

ЖАНЧЫНА (*адначасова*) Чаму вы тут?

ВЫПАДКОВЫ (*адначасова*) Вы хто?

Абое ціха ўсміхаюцца.

ВЫПАДКОВЫ Я нават не ведаю, лепей цяпер пайсці ці калі будзе святлей.

ЖАНЧЫНА А што там такое?

ВЫПАДКОВЫ (*усміхаецца, глядзіць на Жанчыну*) Смешна.

ЖАНЧЫНА Вельмі стрэсава.

ВЫПАДКОВЫ (*зноў усміхаецца*) Не тое слова. Дык як лічыце, цяпер ці на світанні?

ЖАНЧЫНА Я, калі шчыра, увогуле не разумею, што адбываецца.

ВЫПАДКОВЫ Тут не разумець трэба, а дзейнічаць. Разумець будзем потым.
(*да Жанчыны*) Вы колькі ўжо тут?

ЖАНЧЫНА Каб я ведала...

ВЫПАДКОВЫ Разумею, адчуванне часу цалкам змянілася.

ЖАНЧЫНА Вы думаеце, калі мы зараз пойдзем, то там нас могуць...

ВЫПАДКОВЫ Я не думаю, я ведаю.

ЖАНЧЫНА А што там могуць...?

ВЫПАДКОВЫ Там усё могуць.

ЖАНЧЫНА А ўсё – гэта... ?

ВЫПАДКОВЫ Усё.

ЖАНЧЫНА І з вамі гэта...?

ВЫПАДКОВЫ Гэта абмяркоўваць для мужчыны вельмі ганебна.

ЖАНЧЫНА О... Так, даруйце, я не хацела.

ВЫПАДКОВЫ А з вамі?

ЖАНЧЫНА Са мной? О, не. Са мной нічога такога не было. Здаецца.

ВЫПАДКОВЫ Вы не памятаеце?
ЖАНЧЫНА Па шчырасці, я...

На сцяне высвечваюцца фары. Абое заціхаюць, прысядаюць ніжэй. Цень чалавека не відаць.

ВЫПАДКОВЫ У цябе, раптам, няма з сабой вады?

ЖАНЧЫНА (*аглядае сябе*) Не. У мяне ўвогуле нічога з сабой няма.

ВЫПАДКОВЫ Прадбачліва.

ЖАНЧЫНА А вы даўно ўжо тут?

ВЫПАДКОВЫ Як я і казаў, адчуванне часу цяпер паняцце адноснае. Адно зразумела. Забягаць у закрытыя прасторы без скразнога выхаду – ідэя кепская.

ЖАНЧЫНА Вы тут жывяце?

ВЫПАДКОВЫ Калі б я тут жыў, хіба б я тут сядзеў?

ЖАНЧЫНА (*усміхаецца*). Маеце рацыю. А дзе вы жывяце?

ВЫПАДКОВЫ З якой мэтай цікавіцеся? (*ціха смяецца*) Жартую. Жыву і тут, і там. Ну, жыў. Я вельмі люблю вандраваць. Выберуся адсюль, адразу набываю квіток у адзін бок куды-небудзь падалей. А ты дзе б зараз хацела апынуцца?

ЖАНЧЫНА Нават не ведаю.

ВЫПАДКОВЫ Не любіш вандраваць?

ЖАНЧЫНА Я не памятаю.

ВЫПАДКОВЫ (*усміхаецца*) Разумею. Усе былыя пачуцці цяпер таксама змяніліся.

ЖАНЧЫНА Ды не, я рэальна не...

ВЫПАДКОВЫ Ведаеш, я ж не набуду аніякі квіток. Я сам сябе падманваю. Застануся тут назаўжды.

ЖАНЧЫНА Не кажыце так, гэта ж вельмі сумна.

ВЫПАДКОВЫ Затое праўда.

ЖАНЧЫНА І жахліва. Гэта вельмі жахліва.

Чуваць шум гравію. На сцяне з'яўляецца святло ад ліхтарыка. Жанчына і Выпадковы максімальна прыгінаюцца да падлогі. Ліхтарык шукае. Людзі маўчаць.

Ліхтарык апускаецца і знікае. Шум гравію: крокі аддаляюцца.

ЖАНЧЫНА І гэта таксама. Гэта ж вельмі жахліва.

ВЫПАДКОВЫ (*сам сабе*) Лепей цяпер пайсці ці калі развіднее?

ЖАНЧЫНА Я хачу проста крыху пасядзець. Мне трэба крыху пасядзець.

ВЫПАДКОВЫ (*сам сабе*) Яны могуць пачаць выходзіць...

ЖАНЧЫНА Проста пасядзець.

ВЫПАДКОВЫ (*сам сабе*) Але як будзе светла, тыя ж нікуды не сыдуць.

ЖАНЧЫНА Проста пабыць тут.

ВЫПАДКОВЫ (*сам сабе*) Затое пры святле мяне будзе відаць. Калі са мной нешта здарыцца, хтосьці гэта пабачыць. У цемры ніхто не ўбачыць...

ЖАНЧЫНА Быў хлопчык і няма яго, дый і не было яго ўвогуле.

ВЫПАДКОВЫ (*да Жанчыны*) Што?

ЖАНЧЫНА Я проста хачу крыху пабыць тут. У бяспецы.

ВЫПАДКОВЫ У бяспецы? (*блізка нахіляецца да Жанчыны*) Ты ебанулася хіба?

ЖАНЧЫНА Я не ведаю.

ВЫПАДКОВЫ Ты звар'яцела хіба? Ты можа вар'ятка?

ЖАНЧЫНА (*пачынае ціхенька смяяцца*) Можа. Я ж нічога не памятаю, можа і вар'ятка.

ВЫПАДКОВЫ Цішэй! Ты не можаш пачаць тут... Супакойся.

ЖАНЧЫНА (*ціха смяецца*) Так, напэўна я вар'ятка...

ВЫПАДКОВЫ Нельга істэрыку, збярыся зараз жа. Трэба дзейнічаць, а не адчуваць, я ж казаў.

ЖАНЧЫНА (*ціха смяецца*) А скажаце, калі можна будзе адчуваць?

ВЫПАДКОВЫ Слухай, табе відавочна блага. Ты зараз тут істэрыку закоціш і нас пачуюць. І ты ўсіх падставіш!

ЖАНЧЫНА Каго ўсіх?

ВЫПАДКОВЫ (*паказвае ў цемру*) Усіх. Усіх нас!

ЖАНЧЫНА (*узіраецца*) Я нікога не бачу...

ВЫПАДКОВЫ У цябе паходу шок ад перажытага, не ўсе вытрымліваюць. (*паварочваецца ў цемру, да кагосьці)* Бля, а калі яна пабяжыць, то яны мо ўбачаць, адкуль, і прыйдуць сюды? Мо, лепей усім разам тады? Ці хай сабе сядзіць? (*маўчанне*) Маеш рацыю. (*да Жанчыны*) Карацей, глядзі сюды. Ты зараз выходзіш адсюль, і адразу ж, вельмі вельмі хутка бяжыш. Не азіраючыся. Максімальна далёка ад гэтага месца, каб ніхто не зразумеў, адкуль ты выбегла. Разумееш?

ЖАНЧЫНА (*прыціскаецца да падлогі*) Я не хачу. Я не хачу туды.

ВЫПАДКОВЫ Ты можаш гарантаваць, што не пачнеш тут істэрыць праз хвіліну? Я – не. Лепей ідзі.

ЖАНЧЫНА Я не хачу.

ВЫПАДКОВЫ Хадзі! Яны жанчын не чапаюць.

ЖАНЧЫНА Але вы ж пыталі, ці было са мной...

ВЫПАДКОВЫ Ну... Менш. Слухай, я не ведаю. Жанчынам лепей! Проста давай збярыся і руш! Бяжы ва ўсю моц і хутка будзеш дома. І забудзеш гэтае ўсё як жахлівы сон.

ЖАНЧЫНА (*пачынае ціха смяяцца*) Дома... Разумееце, я не памятаю... Гэта піздзец.

ВЫПАДКОВЫ (*падымае Жанчыну за руку і штурхае*) Бяжы!

Жанчына выбягае на вуліцу і вельмі хутка бяжыць па цёмным двары. Ззаду чуваць крыкі: гук нарастае, робіцца бліжэй, дадаюцца галасы. Рэзка ўключаецца яркае святло: Жанчына спыняецца.

ДЗЕЯ 3

Вельмі шмат святла. Жанчыну падхопліваюць пад рукі і вядуць да доўгага стала ў цэнтры светлага пакоя. Перад сталом шмат крэслаў – гэта зала для прэс-канферэнцыі, усе крэслы занятыя людзьмі. Жанчыну падводзяць да сярэдзіны стала, дапамагаюць сесці. У адну руку жанчыне даюць бутэрброд, побач ставяць каву ў пластыкавым кубачку. Людзі ў залі пачынаюць пляскаць у далоні.

МАДЭРАТАР Дзякуй, дзякуй! (*рукой паказвае ўсім спыніцца*). Добры дзень! (*звяртаецца да людзей у залі*) Мы вельмі ўсцешаныя, што вы сёння тут, мы ўдзячныя вам за цікаўнасць да гэтай тэмы. (*звяртаецца да Жанчыны*) Безумоўна, мы неверагодна радыя, што *вы* сёння тут (*людзі прыязна ўсміхаюцца*). Вы, галоўнае, не хвалюйцеся. Усё добра, вы ў бяспецы. І, калі вы гатовыя, то мы можам пачынаць (*Людзі ў залі падымаюць рукі. Мадэратар паказвае на аднаго з іх*).

ЖУРНАЛІСТ 1 Вітаю, журналіст вось такога выдання. Скажу ад нас усіх: мы вельмі ўсцешаныя, што вы з намі, што ў вас атрымалася выбрацца і што цяпер вы ў бяспецы (*усцешаныя плясканні і усмешкі*). Першае пытанне. Раскажыце, калі ласка, якімі былі вашыя першыя хвіліны на волі? Дзякуй.

ЖАНЧЫНА (*разгублена*) Я, па шчырасці, яшчэ неяк не ведаю...

МАДЭРАТАР Так, шчыры дзякуй за вашае пытанне. Мы сёння будзем рухацца, магчыма, не ў самым хуткім тэмпе (*усміхаецца Жанчыне, гладзіць яе па свабоднай ад бутэрброда руцэ*), але нашая мэта – даць як мага больш інфармацыі і данесці яе гэтаму свету. Для псіхікі бывае дужа складана пераключыцца адразу і пачаць адэкватна ўспрымаць рэальнасць, чалавек можа забываць негатыўны вопыт і ўсё, што звязанае з траўмай. Часам, ахвярамі такога забыцця робяцца і першыя шчаслівыя хвіліны бяспекі. Яны могуць быць, як мы кажам, «быццам у тумане» (*лёгкія ўсмешкі ў залі*). Наступнае пытанне? (*паказвае рукой*)

ЖУРНАЛІСТ 2 Добры дзень, журналіст з такім імям з такога выдання. Я разумею, у наколькі цяжкім вы зараз стане, але, магчыма, вы здолееце расказаць нам падрабязнасці – якія вы памятаеце – вашага ўтрымання? У якіх умовах вы знаходзіліся? З кім вы былі? Вы можаце назваць імёны тых людзей? Загадзя дзякуй.

ЖАНЧЫНА (*адкашліваецца*) Шчыра кажучы, я пакуль што вельмі кепска разумею, што адбываецца...

МАДЭРАТАР (*выпраўляе*) Што адбылося, усё гэта ўжо ў мінулым, вы ў бяспецы (*ухвальныя ўсмешкі*).

ЖАНЧЫНА Так. Я... Я памятаю, ну, пакой. Пакой, даволі маленькі. І не было чым дыхаць. І там былі тры жанчыны...

ЖУРНАЛІСТ 2 Нейкія імёны? Вы памятаеце, як іх клічуць? Загадзя дзякуй.

ЖАНЧЫНА Не, яны не прадстаўляліся...

МАДЭРАТАР Як няветліва (*ухвальныя ўсмешкі; да Жанчыны*) Працягвайце, калі ласка.

ЖАНЧЫНА Так, было тры жанчыны.

ЖУРНАЛІСТ 2 Што менавіта яны з вамі рабілі? Загадзя дзякуй.

ЖАНЧЫНА Не, мне ніхто... Яны... Яна, то бок, адна жанчына ўвесь час прапаноўвала мне гарбаты...

ЖУРНАЛІСТ 2 Вы не маглі б распавесці непасрэдна пра той выпадак, калі...

МАДЭРАТАР Паважаныя, давайце не будзем перабіваць. (*да Жанчыны, гладзіць яе па руцэ*) Працягвайце, даражэнькая. Усё ў парадку. Вы ў бяспецы.

ЖАНЧЫНА Так. Адна жанчына гарбаты, а іншая...

МАДЭРАТАР Даражэнькая, даражэнькая, я разумею, што вы вельмі разгубіліся, але гэта надзвычай істотна. Пастарайцеся прыгадаць менавіта *тыя* падзеі. Я разумею, што зараз вы хацелі б на іх забыцца. (*гладзіць Жанчыну па руцэ*) Але яшчэ адзін разок, толькі зараз, мы вельмі просім вас распавесці нам пра ўсё максімальна падрабязна.

ЖАНЧЫНА Я спрабую. Справа ў тым, што я практычна нічога не памятаю, я памятаю пакой і трох жанчын...

МАДЭРАТАР (*бубніць*) Ну вось ізноў... (*у залю, усміхаецца*) Адну секундачку (*адводзіць мікрафон убок*). Мяркую, што ў вас адбылася нейкае замена ўспамінаў, але па нашых дадзеных у тым, што адбылося, не ўдзельнічалі... Але калі ўдзельнічалі, то нам патрэбныя... Разумееце, давайце зрушым далей ад абмеркавання гарбаты (*усміхаецца*). Проста раскажыце, як ёсць, усё самае складанае – і адразу зробіцца лягчэй (*гладзіць Жанчыну па руцэ*) Калі ласка, мы вас вельмі вельмі просім (*усміхаецца*).

ЖАНЧЫНА Я не ведаю, пра што вам распавесці.

МАДЭРАТАР (*вяртае мікрафон на месца*) У мікрафон, калі ласка.

ЖАНЧЫНА Я не ведаю, пра што вам распавесці.

МАДЭРАТАР Давайце дапаможам пытаннямі (*паказвае рукой у залю*). Калі ласка.

ЖУРНАЛІСТ 3 Вітаю, журналіст з іншага выдання. Загадзя дзякуй. Ці засталіся на вашым целе сляды, ці можаце вы іх паказаць? Дзякуй.

ЖАНЧЫНА Прабачце, паказаць што?

ЖУРНАЛІСТ 3 Любое месца, дзе засталіся сляды. Дзякуй.

ЖАНЧЫНА Я не ведаю. У мяне няма ніякіх слядоў. Я не глядзела пакуль што...

ЖУРНАЛІСТ 3 Ніякіх слядоў? І вы не памятаеце імёнаў? Дзякуй.

ЖАНЧЫНА (*да Мадэратара*) Прабачце, тут няма сурвэтачкі? Пакласці...? (*паказвае на бутэрброд, Мадэратар адмоўна ківае*)

ЖУРНАЛІСТ 3 Магчыма, хаця б нейкія асаблівыя адчуванні ў вашым навакольным асяроддзі? Дзякуй.

ЖАНЧЫНА У асяроддзі? У асяроддзі... Мне зусім не было чым дыхаць. Потым было вельмі цёмна.

МАДЭРАТАР Ага, ага, ну вось гэта ўжо штосьці. Далей, далей!

ЖАНЧЫНА І было чаканне. І гукі. І ліхтарык.

ЖУРНАЛІСТ 2 Гукі? Дзякуй.

ЖАНЧЫНА Быццам па меху бульбы. Ці як пляскання ў далоні. Я толькі чула...

ЖУРНАЛІСТ 1 Ліхтарык? Дзякуй.

ЖАНЧЫНА Ліхтарык. Так. Ён нас шукаў.

ЖУРНАЛІСТ 2 Менавіта таму вы вырашылі бегчы? Дзякуй.

ЖАНЧЫНА Я не тое каб вырашыла. Мяне...

ЖУРНАЛІСТ 3 Што з вамі зрабілі? Дзякуй.

ЖАНЧЫНА Не, не, нічога такога. Проста мне зрабілася блага, і я... Мяне папрасілі, папрасілі сысці. Што мне лепей будзе сысці.

ЖУРНАЛІСТ 1 Вы не супраціўляліся прымусу, бо любы гвалт для вас як для жанчыны непрымальны? Дзякуй.

ЖАНЧЫНА Што?

ЖУРНАЛІСТ 2 Вы не супраціўляліся прымусу, бо любы гвалт для вас як для жанчыны непрымальны? Дзякуй.

ЖАНЧЫНА Я не думаю, што гэта мае нейкае дачыненне...

МАДЭРАТАР Вы, відавочна, пакуль што не можаце ацаніць сітуацыю цалкам, з усіх бакоў. (*да залі*) Часам ацэнка сітуацыі перайначваецца, каб мозг даў рады перажытай траўме. Напрыклад, Стакгольмскі сіндром як адзін з самых выбітных (*у залі смяюцца*)… так, так, ну даруйце мне такое аднакарэннае параўнанне – самых вядомых прыкладаў, калі ахвяра пачынае супераживаць агрэсару, адмаўляючы прымус.

ЖАНЧЫНА Напэўна, мне проста пашчасціла. Я не перажывала нічога з таго, аб чым вы зараз кажаце...

ЖУРНАЛІСТ 3 Аб чым мы кажам? Дзякуй.

ЖАНЧЫНА (*да Мадэратара*) А дзе астатнія?

МАДЭРАТАР Астатнія?

ЖАНЧЫНА Дзе астатнія людзі?

МАДЭРАТАР Гэта неверагодна. У такі момант вы турбуецеся аб іншых – вы сапраўдная жанчына. Сапраўдная міласэрнасць (*пляскае ў далоні, некалькі пляскаў падтрымліваюць яго з залі*).

ЖУРНАЛІСТ 3 Вы раней згадвалі, што вам пашанцавала. Вы мелі на ўвазе, нарадзіцца жанчынай?

ЖАНЧЫНА Вас зацыкліла хіба на маёй жанчыннасці?

МАДЭРАТАР (*гладзіць Жанчыну па руцэ*) Давайце ўсе супакоімся і не будзем груба сябе паводзіць і дазваляць эмоцыям панаваць над нашым розумам (*усміхаецца*). Мы ні ў якім разе не змяншаем вашыя пакуты, тое, што вы перанеслі, – гэта жахліва...

ЖУРНАЛІСТ 2 Што вы перанеслі?

ЖУРНАЛІСТ 3 Што менавіта вы перанеслі?

Усе маўчаць.

ЖАНЧЫНА Я… Мне не было чым дыхаць.

Усе маўчаць.

ЖУРНАЛІСТ 3 (*да Журналіста 2*) Гэта безнадзейна.

ЖУРНАЛІСТ 2 (*да Журналіста 3*) Мо ў яе рэальна псіхалагічная абарона і яна на ўсё забылася.

ЖУРНАЛІСТ 1 (*да Журналіста 2)* Ці ёй сорамна расказваць.

МАДЭРАТАР Што ж, усім дзякуй за вашую цікаўнасць, на гэтым нашая прэс-канферэнцыя заканчваецца!

Усе пачынаюць разыходзіцца, Жанчына устае і рухаецца да выхаду, апынаецца ў натоўпе журналістаў, якія таксама выходзяць: натоўп выносіць Жанчыну на вуліцу. У руцэ яна ўсё яшчэ трымае бутэрброд.

ЖУРНАЛІСТКА 4 (*да Жанчыны*) Вітаю, я яшчэ адзін журналіст, вось мая візітоўка, тут ёсць е-мэйл, тэлеграм, вотсап, сігнал, што заўгодна – напішыце мне, свет павінен даведацца пра вас і вашую гісторыю! (*Знікае ў натоўпе)*

ДЗЕЯ 4

Жанчына на вуліцы, перад ёй з'яўляецца Сябар, бярэ за локаць і мякка адцягвае ўбок: яны рухаюцца да кавярні. Побач узнікаюць Сяброўка і Знаёмы.

СЯБАР Гэта поўны булшыт. Ты як?

СЯБРОЎКА (*з іншага боку*) Дай сюды гэты дурны буцер (*забірае бутэрброд з рукі Жанчыны, выкідае*). Ты як?

ЖАНЧЫНА Я не ведаю, шчыра кажучы.

ЗНАЁМЫ (*паказвае рукой на кавярню*) Я месца заняў, калі што.

Усе разам заходзяць у кавярню і плюхаюцца на канапу – быццам сцэна з сіткому.

СЯБРОЎКА Табе ўзяць чаго? Што ты хочаш? Як звычайна?

ЖАНЧЫНА Я не ведаю, шчыра кажучы.

ЗНАЁМЫ Я вазьму (*адыходзіць да стойкі*).

СЯБАР Добра, мо трэба неяк змяніць тэму ці што. (*да Жанчыны*) Ці ты хочаш гэта абмеркаваць?

ЖАНЧЫНА Я не ведаю, калі шчы... А піва тут няма?

Усе (акрамя Жанчыны) смяюцца. Іх дапаўняе смех па-за кадрам.

ЗНАЁМЫ (*вяртаецца з падносам, на ім чатыры вялікія кубкі*) Усім мача латэ.

СЯБРОЎКА Маця.

ЗНАЁМЫ Нават не пачынай.

СЯБАР Дзякуй, мы вельмі ўдзячныя, яна не хацела абясцэніць тваю дапамогу.

ЗНАЁМЫ (*да Жанчыны*) Ты выпі, папусціся. Усё ўжо скончылася.

СЯБАР Так, мы ўсе нарэшце можам папусціцца (*цягне кубак, усе чокаюцца*)

СЯБРОЎКА Дагэтуль гэтае месца асацыюецца, канешне. Цікава, калі гэта пройдзе і будзе адчуванне бяспекі.

СЯБАР І ў акно глядзіш, і згадваеш адразу...

ЗНАЁМЫ А ты не глядзі ў акно.

Сіткомаўскі смех па-за кадрам.

ЗНАЁМЫ (*да Жанчыны*) Цікава, канешне, чаму яны цябе абралі.

СЯБАР Зайздросціш, што не цябе?

СЯБРОЎКА Зайздрасць – гэта грэх!

ЖАНЧЫНА Амінь.

Сіткомаўскі смех па-за кадрам.

СЯБАР Нейкае няёмкае маўчанне. Як вам надвор'е сёння?

СЯБРОЎКА +21, па адчуваннях як -37.

Сіткомаўскі смех па-за кадрам.

ЗНАЁМЫ Вы вось іранізуеце, а я ж абсалютна не пра зайздрасць. Я хутчэй пра гендарныя арыенціры.

СЯБРОЎКА А што кепскага ў тым, што яна жанчына?

СЯБАР А ён, зрэшты, і не казаў, што гэта кепска.

ЗНАЁМЫ Ды я проста разважаю. (*да Жанчыны*) Ты ж разумееш, што табе пашанцавала?

СЯБАР Эй! Ну камон!

СЯБРОЎКА Не перагінай!

ЗНАЁМЫ Перагінаюць палкі, а калі палкі няма, то і...

Сіткомаўскі смех па-за кадрам.

ЗНАЁМЫ Добра, добра, даруйце, не хацеў. Я не пра тое ўвогуле.

СЯБАР (*да Жанчыны*) А ты чаго не п'еш?

ЖАНЧЫНА (*сарамліва*) Я хацела спытаць... што блін такое маця латэ?

Усе (акрамя Жанчыны) смяюцца. Іх дапаўняе смех па-за кадрам.

СЯБАР М*а*ча.

СЯБРОЎКА Захапляюся, як мы здольныя смяяцца нават у такія часы.

ЖАНЧЫНА ... І ў любых незразумелых сітуацыях.

Сіткомаўскі смех па-за кадрам.

ЖАНЧЫНА А вы заўжды так весела седзіце?

СЯБРОЎКА «Вы», кажа!

СЯБАР Увогуле, звычайна ты – галоўная жартаўніца.

СЯБРОЎКА Мне смяяцца дужа дапамагае. Гэта пра адчуванне бяспекі.

Сіткомаўскі смех па-за кадрам.

ЗНАЁМЫ Гэта яшчэ адзін істотны момант, дарэчы. Што жанчынам прасцей свае пачуцці выказваць.

СЯБРОЎКА І што?

ЗНАЁМЫ А мужчыны ўсё ў сабе трымаюць, яны мусяць быць паважнымі. Яны ў прынцыпе ўсе эмоцыі закопваюць і ніяк не перапрацоўваюць.

ЖАНЧЫНА Як бутэлькі ў лесе.

Усе (акрамя Жанчыны) смяюцца. Іх дапаўняе смех па-за кадрам.

СЯБАР Ну вось усё і вяртаецца да вытокаў! Чырз! (*цягне кубак, усе чокаюцца*).

СЯБРОЎКА (*да Знаёмага*) Ну добра, вось у цябе пачуццё небяспекі ўва што візуалізуецца?

ЗНАЁМЫ У дзвярны праём.

Сіткомаўскі смех па-за кадрам.

СЯБРОЎКА А ў мяне ў ката. Мне здаецца, яны прыйдуць і пачнуць... ну, пачнуць гэтыя працэдуры свае, і яны выцягнуць майго ката і штосьці з ім зробяць на маіх вачах проста каб мяне раззлаваць. Што яны яго заб'юць, каб мне кепска было.

ЗНАЁМЫ Але увойдуць жа яны праз дзвярны праём?

Сіткомаўскі смех па-за кадрам.

СЯБАР (*да Жанчыны*) Ты як? Мо, нам пра штось іншае пагаварыць?

ЖАНЧЫНА Не, мне дарэчы вельмі цікава...

ЗНАЁМЫ Слухайце, ну мы, напэўна, можам ужо так не трэсціся над ёй. Па праўдзе ж усім кепска.

СЯБРОЎКА Здаецца, нехта вырашыў адкапаць бутэлькі – ой! – эмоцыі...

Сіткомаўскі смех па-за кадрам.

ЗНАЁМЫ А ты ведаеш, што па статыстыцы мужчыны больш за ўсё баяцца, што з іх будуць смяяцца?

ЖАНЧЫНА А жанчыны – гвалту.

ЗНАЁМЫ А мужчыны – што будуць смяяцца!

Сіткомаўскі смех па-за кадрам.

СЯБРОЎКА Мне не падабаецца гэты вайб. Гэта не пра адчуванне бяспекі.

ЖАНЧЫНА *(да Знаёмага)* Я не зусім разумею, ты быццам злуешся на мяне? Ці што ты хочаш сказаць?

ЗНАЁМЫ Ну вось да прыкладу, ты калі пайшла туды...

ЖАНЧЫНА Куды?

СЯБАР (*да Знаёмага*) Ты ўжо токсік.

ЗНАЁМЫ (*да Жанчыны*) Да ну ты ж разумееш, пра што я. Я маю на ўвазе, што ты ж зручна была адзетая, так? Каб зручна было рухацца, бегаць...

СЯБРОЎКА (*іранічна*) Супраціўляцца.

Сіткомаўскі смех па-за кадрам.

ЗНАЁМЫ То бок, нічога ж дзіўнага, што яны так гэта ўспрынялі. Ты ведала, на што ішла. Ты ведала, якія абставіны і як гэта выглядае з боку.

СЯБАР (*да Знаёмага*) Ты супер токсік.

ЖАНЧЫНА (*да Знаёмага*) Я крыху задзяўбалася паўтараць, што я нічога не памятаю, ясна?

ЗНАЁМЫ Вельмі зручная пазіцыя, пагадзіся.

ЖАНЧЫНА Тыпу, я хлушу?

СЯБРОЎКА Увогуле, нам крыху крыўдна, канешне.

СЯБАР Ну, ты нават не намагалася ўспомніць.

ЗНАЁМЫ Нуль высілкаў. Проста сядзіш і вачыма лупаеш. Зрэшты памяць, вядома, неверагодна цікавая штука.

СЯБАР Ну грубіць не варта, але, агулам, так.

СЯБРОЎКА І пра латэ крыўдна.

ЗНАЁМЫ Вось колькі ў памяці свядомага ўвогуле?

СЯБРОЎКА Ніколькі. Вось я памятаю, як...

СЯБАР (*перабівае*) Што ёсць свядомае ў прынцыпе?

ЖАНЧЫНА Неяк тут зусім няма чым дыхаць...

Усе (акрамя Жанчыны) смяюцца. Іх дапаўняе смех па-за кадрам.

СЯБРОЎКА Галоўнае, быць у моманце.

СЯБАР А я думаў, у рэсурсе.

ЗНАЁМЫ Ненадзейны расказчык, нашая памяць – ненадзейны расказчык.

СЯБРОЎКА Каму ж тады верыць, калі не сабе?

СЯБАР (*ківае ў бок Жанчыны*) Ты думаеш, яна сабе цяпер верыць?

ЗНАЁМЫ А мы? Ты думаеш, мы ёй цяпер верым? Ніхто не ведае, толькі яе словы аб тым, што было...

ЖАНЧЫНА Што было?

Сіткомаўскі смех па-за кадрам.

ЖАНЧЫНА Што было?

Сіткомаўскі смех па-за кадрам.

ЖАНЧЫНА Што было?

Сіткомаўскі смех па-за кадрам.

ЖАНЧЫНА Піздзец. Поўны піздзец.

Жанчына ўстае і выходзіць з кавярні на вуліцу. У кішэні намацвае візітоўку Журналісткі 4. Набірае нумар і тэлефануе.

АКТ 2
ДЗЕЯ 5

Вёска, хлеў. Пасярод хлява ляжыць парсюк, у сэрцы невялікая рана ад нажа. Яна ходзіць вакол парсюка, абкладае таго саломай. Заходзіць Ён, у руках вялікі таз. Ён ставіць таз побач з парсюком, бярэ салому, дапамагае Ёй абкладаць.

ЯНА А сёння якую?

ЁН Жылі-былі дзед і баба.

ЯНА Такія мы ўжо старыя, па 20 гадоў усяго!

ЁН (*смяецца*) Дык гэта не пра нас!

ЯНА Ага, ну.

ЁН Ну дык жылі-былі. І пайшоў неяк дзед па дзіка ў лес.

ЯНА А што, ў іх дзіка не было?

ЁН Ну свайго-то і не было.

ЯНА Такія ўжо гаспадары.

ЁН Ну, то пайшоў дзед па дзіка ў лес ды знік.

ЯНА (*іранічна*) Анягож!

ЁН Дзень няма, два няма. Сядзіць баба, чакае, слязьмі абліваецца.

ЯНА (*смяецца*) От ужо абліваецца! Думае, дзе той дурны падзеўся, можа ў суседа так настойкай настаяўся, што і стаяць не можа.

ЁН Ну дык вось сядзіць баба, сумуе...

ЯНА Не, не так. Устала баба, сабрала сабе мяшэчак і пайшла дзеда шукаць, дзе той небарака лясы точыць. Ідзе, ідзе і суседка ёй насустрач. Пытае ў суседкі: «А дзе-та мой падзеўся, можа бачыла?» А суседка кажа: «Дык бачыла як днямі ў лес ішоў. Чаго ідзеш, пытаюся. Кажа, пайду самага вялікага дзіка знайду і будзе ў нас дзік свой! Так ужо і свой, кажу. Лес той чый, пытаю? То і дзік той чый значыць? А ён адмахнуўся і пайшоў». Паківала баба і пайшла далей. Заходзіць у лес, там аканом.

ЁН Нос нізкі, бот слізкі, бо лізаў панскія палуміскі (*смяюцца*). І пачынае той аканом пытацца адразу, куды тая баба ідзе, а чаму, а ўжо ж так позна...

ЯНА «Дый на шпацыр вось выйшла, аканому. Ногі размяць».

ЁН «Ага, на шпацыр, ага», -- аканом кажа. -- «А я думаю, што ў маліннік ты панскі ідзеш па ласункі».

ЯНА «Ды што ж я дурная такім шляхам у маліннік ісці, калі вось праз там яно хутчэй будзе!»

ЁН «Ды якое хутчэй, што ж я, аканом, не ведаю дзе маліннік? А ну давай-ка з табой хто хутчэй да малінніка таго». І вочы ў таго аканома ўжо загарэліся, думае, як тую бабу зараз прыцісне да дрэва ў лесе ды павесяліцца.

ЯНА Але ж баба ведае, што калі гэткім шляхам да малінніка ісці -- у воўчую яму трапіш, бо сама тую яму днямі з дзедам і рабіла. «Канешне, аканоме, давай ты гэтым шляхам, я тым – ля малінніку й сустрэнемся!» І пасміхаецца.

ЁН Пайшоў аканом у лес, усмешка да вушэй, думае пра свае справы гнусныя і пад ногі не глядзіць. Раз – і ў яму праваліўся!

ЯНА Ды нагу зламаў!

ЁН Ды руку таксама! Ды...

ЯНА Ну ўсё, усё, досыць.

Ён падпальвае салому і чакае, пакуль уся не згарыць. Як дагарэла, Ён і Яна бяруць нажы і пачынаюць бруд і сажу саскрабаць са шкуры: пад імі шкура белая, чыстая.

ЯНА А баба ж далей ідзе, дзеда шукаць. Ужо глыбока ў лес зайшла, так што і неба амаль не відаць. А дзеда ўсё няма. Дайшла да палянкі, прысела, мяшэчак свой развязала, кішкі кавалак дастала і сядзіць жуе.

ЁН Тут чуе: нехта праз хмыз прадзіраецца. Можа, дзед?

ЯНА А не, то пан на паляванні ад усіх паехаў наперад, каб першым звера забітага пабачыць – дый згубіўся!

ЁН Бо нашто таму пану мазгамі думаць, калі можна ў такія вопраткі вялікія апрануцца, ды на каня сесці самага вялікага, ды на ўсіх зверху пазіраць.

ЯНА І вось прадзіраецца той пан праз хмыз ды на палянку выходзіць ды бачыць бабу, якая кішку ясі. А пан той галодны, вай вай, амаль дзве гадзіны не еў ужо. І давай крычаць бабе:

ЁН (*адначасова; па-польску*) «Цо ты еш таки? Дай ми!» (*смяюцца*)

ЯНА (*адначасова; па-руску*) «Что ты ешь эдакое? Дай мне!» (*смяюцца*)

ЁН А тая баба і кажа яму...

ЯНА Гэта ж, паночку, я свой жывот разадрала ды кішкі свае ем. Але ж тое кішкі прыгоннае бабы, нашто табе такія, калі ты сваімі панскімі пачаставацца можаш?

Ён выцірае саломай нож, падыходзіць да парсюка і нож устаўляе ў дзірку што ў грудной клетцы.

ЁН У пана вочы загарэліся, такі ласунак яму зараз будзе! Разадраў свой жывот дый памёр.

Ён ускрывае грудную клетку, у таз адтуль цячэ кроў.

ЯНА з А баба кішку тую дажавала дый да хаты пайшла. Бо не дурань жа той дзед сам лесу не выбрацца.

ЁН А дзед ужо у хаце даўно, дзічка закалоў, саломай абклаў ды бабу чакае – кішкі смачныя рабіць!

Ён і Яна смяюцца і смачна цалуюцца ў вусны.

ЯНА Ты ж толькі як будзеш каму расказваць на жывёл памяняй.

ЁН Добра, будзе пра лісу, ваўка і зайца.

Ён бярэ ў рукі таз, яны выходзяць з хлява.

ДЗЕЯ 6

Пакой. У крэсле сядзіць Жанчына, побач з ёй Журналістка, у яе ў руках дыктафон. Уладкаванае яркае асвятленне. Аператар глядзіць у камеру на штатыве: вядуцца здымкі.

ЖАНЧЫНА Шчыра кажучы, я нічога пра іх не памятаю. Дакладней, не ведаю. Я нават не ведаю, як іх клічуць.

Некаторы час усе маўчаць.

ЖАНЧЫНА Кішку ведаю.

ЖУРНАЛІСТКА Кішку?

ЖАНЧЫНА Кілбасу такую, як пальцам пханую.

ЖУРНАЛІСТКА А. Я думала, гэта ўкраінскае.

АПЕРАТАР Я думаў польскае.

ЖАНЧЫНА Ну не ведаю. Я ведаю, што беларускае. Там кішкі, грэчка, шкваркі і свежая кроў трэба. Я адзін раз бачыла, як такую гатуюць, у вёсцы. Так. Гэта беларускае. Гэта я ведаю.

Некаторы час усе маўчаць.

АПЕРАТАР Я думаў, з бульбы будзе нешта.

ЖАНЧЫНА Ой, ідзіце ў сраку.

ЖУРНАЛІСТКА (*хавае ўсмешку*) Даруйце, калі ласка. Што-небудзь яшчэ памятаеце?

ЖАНЧЫНА Больш нічога. Але я ж кажу, мне здаецца, я там нічога і не ведала ніколі. Таму і не памятаю (*усе маўчаць*). Слухайце, гэта вельмі дзіўна. Я зараз зразумела, што я ў нейкім сэнсе зайздрошчу... ну, зайздрошчу афраамерыканцам. Таму што... Разумееце, яны ведаюць гісторыю свайго рабства. Разумееце?

ДЗЕЯ 7

*Кузаў машыны. Унутры сядзяць Беларус, Я**эй і Украінка. Сядзяць спакойна, машыну толькі час ад часу падкідвае на калдобінах. Украінка паглядвае у акно.*

БЕЛАРУС Якая карысць ад таго, што вы гледзіце?

УКРАІНКА А яка користь від того, що ви?

Некаторы час едуць моўчкі.

Я**ЭЙ

יהודי, בלארוסי ואוקראיני נכנסים למסעדה...

УКРАІНКА Ну ось знову.

БЕЛАРУС (*усміхаецца*) Вусная народная творчасць на тое і вусная, каб яе ўслых… ну, перадаваць.

Некаторы час едуць моўчкі.

УКРАІНКА Як ви вважаєте, ми зараз де?

Я**ЭЙ

מנקודת מבט אקזיסטנציאלית?

БЕЛАРУС (*да Украінкі*) А што вы там бачыце?

УКРАІНКА Та поля одні, сіре все, так...

Я**ЭЙ

ספרו לנו משהו מעורר השראה. מה אתם בכלל רוצים להרוג אותנו?

УКРАІНКА Яка ви, виявляється, романтична людина.

Я**ЭЙ

ומה אתם חשבתם?

УКРАІНКА А я думала, що ви є**ей.

Я**ЭЙ

אני משורר.

БЕЛАРУС Гэта я паэт.

УКРАІНКА Жодного чоловіка, одні поети.

БЕЛАРУС Проста ўсіх мужыкоў ужо адвезлі (*ківае галавой, з намёкам на масавыя расстрэлы*), перад паэтамі.

Усе смяюцца.

Я**ЭЙ

נכנסים יהודי, בלארוסי ואוקראינית ...

УКРАІНКА Мені більше до вподоби ваш романтичний настрій.

Я**ЭЙ

והינה עומד אני במסדרון בית סוהר...

Усе смяюцца.

БЕЛАРУС *(Я**эю)* А прачытайце-ка нам штось са свайго?

Я**ЭЙ

ואני ממש עכשיו אכתוב לכם משהו.

*Некаторы час едуць моўчкі. Я**эй думае.*

Я**ЭЙ

כשבשדות של המאות שלי,
אשכב אני בצל עייף, שלפי
רצונו
אהיה מזון לפרות.

УКРАІНКА А ось це правильно.

БЕЛАРУС Адзначу, што мне вельмі даспадобы тое, з якой іранічнай лёгкасцю вы спалучаеце гэткі філасофскі дух з духам зямным.

Я**ЭЙ

דה רבה לכם בני הלוויה שלי. הייתי מציע לכם
בעד זה לפחות לשתות כוס מים, אבל כפי שכולם יודעים...

УКРАІНКА Побережемо.

БЕЛАРУС А ці вядомы нам, у рэшце рэшт, наш канчатковы прыпынак?

Я**ЭЙ

לפי המשמעות האקזיסטנציאלית?

УКРАІНКА Судячи з того, як довго ми їдемо, і краєвидами, то ...

Я**ЭЙ

"ארץ רחבה שלי, מולדת..."

Усе смяюцца.

БЕЛАРУС (*да Украінкі*) А вы замужам?

УКРАІНКА А ви з якою метою цікавитеся?

БЕЛАРУС Вядома ж, замужам. Стаўлю на тое, што й за беларусам!

Я**ЭЙ

(לאוקראינית) מה תספרי?

УКРАІНКА Скажу, що чорт його знає, як тепер правильно відповідати.

Усе смяюцца. Некаторы час едуць моўчкі.

УКРАІНКА (*Є**ею*) А ви все питаєте про екзистенційний сенс. А я цього не розумію.

Я**ЭЙ

מבינים, אקזיסטנציאלי זה כל מה שקשור לא רק לנקודות ההתחלה והסוף של דרך החיים שלנו אלא לדרך שביניהם. הרי כל נקודות ההתחלה והסוף ידועות לנו ולכן אינן מעניינות.

БЕЛАРУС А цікавыя нам свядомыя і несвядомыя рашэнні чалавека, датычныя яго лёсу; рашэнні, якія прымаюцца ўжо без страху смерці альбо ціску грамадскай ганьбы, а выключна чалавекам пра самога сябе. Страшная і моцная свабода…

УКРАІНКА (*задумливо*) Одне питання. Звідки ви таке знаєте?

БЕЛАРУС (*адначасова*) Мужчынская гімназія.

Я**ЭЙ

(כולם ביחד) גימניסיית גברים.

УКРАІНКА (*сміється*) Усіх чоловіків забрали, тепер уже навіть поетів. Вперед, жінки!

Я**ЭЙ

מסתבר שאת גם משוררת !

БЕЛАРУС Альбо замужам за паэтам! Стаўлю, што вы едзеце за каханым у далёкі…
УКРАІНКА Якщо я по коханого їду, то господарство ж тоді на кому?

Усе смяюцца.

Я**ЭЙ

קחי אותי בדרך מסתובבת,
מכונית שחורה גדולה.
וכאשר נינה שלי תשאל אותי,
תגיד" שאחזור הביתה בעל שיבה או מת.

Некаторы час усе едуць моўчкі.

УКРАІНКА Заходять є**ей, білорус та українка до бару…

Усе смяюцца.

БЕЛАРУС Як скончыцца гэта ўсё, паеду ў…

УКРАІНКА Як скінчиться? Та ну що ви...

БЕЛАРУС Як скончыцца (!) гэта ўсё, паеду ў Парыж! Адразу ж! Буду шпацыраваць, удыхаючы веснавое паветра, хадзіць у музеі, у тэатры, размаўляць з людзьмі…

УКРАІНКА (*одночасно*) А я додому (*посміхається*).

Я**ЭЙ

(כולם ביחד) ואני הביתה (צוחקים)

БЕЛАРУС Што з нашым домам адбылося… І хто ў тым вінаваты.

Я**ЭЙ

פולנים.

БЕЛАРУС Чаму палякі?

Я**ЭЙ

בכל זאת הפולנים יאשמו בהכל

БЕЛАРУС А сярод нас тут ніводнага. І дзе ўсе тыя палякі?

УКРАІНКА Хто його знає (*розводить руками, натякаючи на масові розстріли*)

БЕЛАРУС (*Я**эю)* А вы, дарэчы, польскі я**эй, беларускі ці ўкраінскі?

Я**ЭЙ

ואתה יהודי בלארוסי, פולני או אוקראיני? או אולי רוסי?

БЕЛАРУС Чорт яго ведае, як цяпер правільна адказваць.

Я**ЭЙ

אההה... כמה טוב שרכשנו את מושג האומה...

Усе смяюцца.

БЕЛАРУС Але ж палякаў шкада. Шкада, што ўва ўсім заўжды вінавацяць палякаў.

Я**ЭЙ

נוווו, מה לומר, בהכל ותמיד...

БЕЛАРУС Вам да іх далёка…

Я**ЭЙ

ואתה?

УКРАІНКА Дорогі товариші! Перші національ-екзистенційні ігри оголошуються відкритими!

Усе смяюцца.

БЕЛАРУС Але ж не самае належнае выкарыстанне паняцця «экзістэнцыяльны»…

УКРАІНКА Та мені до сракі.

Усе смяюцца. Некаторы час едуць моўчкі.

Я**ЭЙ

נסנסים יהודי, בלארוסי ואוקראינית למסעדה ושם אומרים להם:...

УКРАІНКА (*перебиває*) Розстріляти!

Усе смяюцца.

БЕЛАРУС *(сур'ёзна)* Толькі б лагер.

УКРАІНКА *(серйозно)* Оце б пощастило.

Я**ЭЙ

(ברצינות) מזל שזה לא בור

УКРАІНКА Ну не треба про це тут говорити.

БЕЛАРУС А якая розніца? Усё адно гэтага не было. Нічога гэтага ніколі не было.

ДЗЕЯ 8

Пакой. У ім усё тыя ж Жанчына, Журналістка, Аператар.

ЖАНЧЫНА Гэта, атрымліваецца, прабабулі / прадзядулі? Я ведаю толькі, што адну прабабулю клікалі Галя, а яшчэ здаецца прадзед быў Якаў, і яшчэ здаецца Васіль.

ЖУРНАЛІСТКА Вы, атрымліваецца, чыстая беларуска па паходжанні?

ЖАНЧЫНА Гэта вы чаму так вырашылі? Таму што я зусім не ведаю сваю гісторыю?

ЖУРНАЛІСТКА Зусім не ведаеце? А магілы? Мабыць, памятаеце якія-небудзь магілы?

ЖАНЧЫНА Памятаю, што на іх было па-польску ўсё напісана.

ЖУРНАЛІСТКА Што ж гэта, значыць, вы – полька?

ЖАНЧЫНА Гэта абсалютна нічога не значыць.

ДЗЕЯ 9

Паліклініка. Маці чакае на прыём: больш людзей няма. Санітарка старанна мые падлогу: туды – сюды, туды – сюды. На трэцім ці пятым бясконца доўгім цыкле мыцця падлогі адчыняюцца дзверы кабінета доктара.

ДОКТАР Заходзьце, наступны!

Маці заходзіць у кабінет. Доктар ніводнага разу не падымае галавы ад запаўнення папер падчас усёй размовы.

ДОКТАР (*працягвае запаўняць паперы*) Сядайце. Ну, як справы ў вас?

МАЦІ Ды, ведаеце, нічога, здаецца, нармальна. Паціху. А ў вас?

ДОКТАР Таксама тут, ведаеце, паціху. Працуем вось. Як заўжды, без перадыху. А што як сям'я вашая?

МАЦІ Усё неяк добра, здаецца, нармальна, нічога сабе. Муж вось працуе, там усё стабільнае. Заробак два разы цяпер, атрымліваецца, у месяц, па частках, адзін раз як быццам аванс, а другі раз як быццам заробак. Ну, у вас напэўна таксама так?

ДОКТАР Так, усё так жа, чакаем акурат днямі. Але тут добра ўсё; мы, ведаеце, не скардзімся.

МАЦІ Ды й мы, ведаеце, таксама, і мы. Дачка вось у дзіцячы садок пайшла. Мы ўсё не можам паверыць, лічы каля самага дома, атрымліваецца, дужа зручна. І я нават пару разоў на працы затрымалася, дык нічога, не

сварыліся на мяне, нічога кепскага не сказалі – зразумелі становішча. Вельмі нам пашанцавала з гэтым садком.

ДОКТАР А ў мяне ж старэйшы ў школу пайшоў!

МАЦІ Як у школу!

ДОКТАР У школу! Уяўляеце? У першы клас!

МАЦІ Гэта колькі яму ўжо, атрымліваецца?

ДОКТАР Шэсць і дзевяць месяцаў, мы крыху раней.

МАЦІ Які дарослы ўжо!

ДОКТАР Як хутка растуць дзеці!

МАЦІ І не кажыце! А мая ў дзіцячы садок вось пайшла!

ДОКТАР І як, падабаецца вам?

МАЦІ Вельмі пашчасціла нам, выхавацелькі добрыя, кормяць смачна. І зусім каля дома!

ДОКТАР А нам трэба прайсці крыху, таму яго муж цяпер раніцай адводзіць, калі ў яго змены ранішняй няма, а калі ёсць, то ў мяне акурат другая змена і я тады яго адводжу. Вось так зручна ў нас атрымалася!

МАЦІ Вось як вам пашчасціла! Як гэта добра атрымалася.

ДОКТАР Мы самі ўсё здзіўляемся, як гэта добра атрымалася. А што ж вы сама, як маецеся?

МАЦІ Ды цудоўна, ведаеце, нават і паскардзіцца няма на што. Нават прастуды не было сёлета!

ДОКТАР Вось гэта цудоўна. Вы зарадку робіце? Вітаміны п'яце?

МАЦІ Тут справа такая, вы ж ведаеце, пакуль дзіцёнка раніцай збярэш, па хаце пабегаеш дый рэчы, цацкі пазбіраеш – вось і зарадка (*смяецца*).

ДОКТАР (*смяецца*) Ох, і не кажыце!

МАЦІ А вітаміны ж у нас усе ў натуральным выглядзе, так бы мовіць, што з градкі сабралі (*смяецца*). Цяпер вось красавік, дык авітаміноз, вядома, адчуваецца крыху...

ДОКТАР Затое якое надвор'е сёння цудоўнае!

МАЦІ Ах, такое сонейка там! І цёпла зусім як летам! Так прыемна прагуляцца! Абавязкова прагуляйцеся сёння!

ДОКТАР Ой, я абавязкова дахаты сёння пешшу прайдуся, падыхаю. А тое ў засценках гэтых, зусім ужо галава ідзе кругам.

МАЦІ (*крыху занепакоена*) Ведаеце, я вось чаму... Я... Мне сястра з Украіны... У мяне сястра ж пад Кіевам, жыве яна там...

ДОКТАР А ў іх там зусім ужо цёпла, напэўна!

МАЦІ … Яна патэлефанавала мне проста сёння... Яна кажа, што ўчора, ну... Што сёння...

ДОКТАР Сёння цудоўнае надвор'е, проста цудоўнае!

МАЦІ Што ёд вось...

ДОКТАР Ёд?

МАЦІ Таблеткі, мо, нейкія.

ДОКТАР Таблеткі?

МАЦІ Ці, мо, настойка якая. Але я неяк не зразумела нічога, таму што...

ДОКТАР Я, канешне, не ведаю, як у іх там у Кіеве...

МАЦІ Яна не зусім у Кіеве, яны там хутчэй ў прыгарадзе...

ДОКТАР Але ў нас тут з градкі гароднінка – лепшыя лекі! Даруйце, тут спраў, бачыце, колькі, я б ужо...

МАЦІ (*супакойваецца*) Так, так. Вось і я так сказала! Прабачце, што патурбавала. Шчыры вам дзякуй!

ДОКТАР І вам, і вам.

МАЦІ (*кладзе шакаладку на стол, устае, паступова адыходзіць да выхаду*) Прабачце, калі ласка, яшчэ раз, што патурбавала!

ДОКТАР Ды нічога, што ж вы. Я тут... проста спраў вось бачыце колькі, так бы я б...

МАЦІ Што вы, вядома! Я ўсё разумею!

ДОКТАР Цудоўнае надвор'е сёння!

МАЦІ Там дожджык, бачу, накрапвае, праўда, але гэта нічога страшнага, я вось вельмі люблю пад цёплым дожджыкам пагуляць.

ДОКТАР Гэта ж першыя летнія дажджы!

МАЦІ Ахаха, цудоўна! Дзякуй вам яшчэ раз, шчыры дзякуй!

ДОКТАР Ды гэта вам дзякуй! Не хварэйце!

МАЦІ Ах, і вы! Будзьце здаровенькія!

ДЗЕЯ 10

Пакой. У ім усё тыя ж Жанчына, Журналістка, Аператар.

ЖАНЧЫНА У бабулі быў рак скуры.

ЖУРНАЛІСТКА Мае спачуванні.

ЖАНЧЫНА Невялікі.

ЖУРНАЛІСТКА Невялікі рак?

ЖАНЧЫНА Ну там нічога страшнага, у яе проста шнар такі невялікі на ілбе.

ЖУРНАЛІСТКА Невялікі?

ЖАНЧЫНА Яна, здаецца, у камандзіроўку ездзіла кудысьці туды...

ЖУРНАЛІСТКА А куды? Не памятаеце?

ЖАНЧЫНА Але яны дэталяў не распавядала.

ЖУРНАЛІСТКА Што-небудзь яшчэ памятаеце?

ЖАНЧЫНА Здаецца, больш нічога.

ЖУРНАЛІСТКА Зразумела.

Журналістка выключае дыктафон, падыходзіць да Аператара: яны абмяркоўваюць нататкі і праглядаюць фрагменты відэа на камеры. Жанчына нейкі час працягвае сядзець.

ЖАНЧЫНА Прабачце, калі ласка, вы не ведаеце, калі гэта скончыцца?

Журналістка і Аператар не чуюць. Жанчына яшчэ крыху сядзіць і сыходзіць у суседні пакой.

АКТ 3
ДЗЕЯ 11

ЖАНЧЫНА
ХОР Суседскія галасы і гукі (можа дапаўняцца)

Жанчына ў пакоі. Яна адна. Яна сядзіць / стаіць / падыходзіць да акна / што заўгодна: публічная адзінота.

ХОР

«Гэта дзе гэта?» «Не крычы а!» «Я зараз міліцыю паклічу!»
Грукат па батарэі «Ля ля ля» «Чаму гэта не працуе тут а»
«Кот бляць!» «Вы мяне чуеце?» «Русское раааадииииоооо. Все будет хорошо!»
«Колькі можна галдзець?» «Зайка, ну прыбяры цацкі» «АХАХАХАХА»
«Ды дзяўбі ты, дзяўбі!» Вібрацыя тэлефона «Чуваць?»
«Ты не памятаеш, дзе гэтая хрэнь?» «Калі ласка, не трэба!» «Баю, баю, а-а-а-а, а-а»
Лай сабакі «Другая черная как нооочь уаа-а-а!» «Я пайду пакуру» «Мяне чуваць?»
«Бузівузібозе цям цям цям» «Зверы!» Гук зліва вады ва ўнітазе
«Мама, я страціла шлёпкі за дзесяць даляраў» Грукат па батарэі
«АХАХАХАХАХА» «Посуд памый а» «За што?» «Туды давай!»
«Міліцыю паклічу!» «Аддай штаны!» «Ды не плач ты, госпадзі, тваю маць!»
«Вы чуеце мяне?» «АХАХАХАХА» Гук скайпу «Ты супакоішся бля!»
«Дык а ты што?» «А дзе та гэта?» «Бля не туды!»
«Танцуй пока молодой, мальчик!» «А калі гэта ўзяць?» «Ты мяне чуеш?»
Плач дзіцёнка «Што вы робіце?!» «Русское раааадииииоооо. Все будет хорошо!»
«Я зараз міліцыю паклічу!» Гук зліва вады ва ўнітазе «Да ну бля так яе ну і ўсё!»
«Вы мяне чуеце?»
«Супакоіўся...»
«Радыё цішэй зрабі а»
Грукат па батарэі
«Хто-небудзь мяне чуе?»
«АХАХАХАХА»

Цішыня
Цішыня
Цішыня

ДАДАТАК

ДЗЕЯ 7

*Кузаў машыны. Унутры сядзяць Беларусь, Я**эй і Украінка. Сядзяць спакойна, машыну толькі час ад часу падкідвае на калдобінах. Украінка час ад часу глядзіць у акно.*

БЕЛАРУС Якая карысць ад таго, што вы гледзіце?

УКРАІНКА А якая карысць ад таго, што вы?

Некаторы час едуць моўчкі.

Я**ЭЙ Заходзяць я**эй, беларус і ўкраінка да бару...

УКРАІНКА Ну вось зноўку.

БЕЛАРУС (*пасміхаецца*) Вусная народная творчасць на тое і вусная, каб яе ўслых… ну, перадаваць.

Некаторы час едуць моўчкі.

УКРАІНКА Як вы лічыце, мы зараз дзе?

Я**ЭЙ З экзістэнцыяльнага пункту гледжання?

БЕЛАРУС (*да Украінкі*) А што вы там бачыце?

УКРАІНКА Ды палі адныя, шэрае ўсё, ды...

Я**ЭЙ Не, не, не, так нам не трэба. І так цяжка, вы што ж, зусім прыгнесці нас хочаце? Вы нам раскажыце штось натхняльнае.

УКРАІНКА Які ж вы, аказалася, рамантычны чалавек.

Я**ЭЙ А як вы думалі?

УКРАІНКА А я думала, вы я**эй.

Я**ЭЙ Я паэт!

БЕЛАРУС Гэта я паэт.

УКРАІНКА Ніводнага мужыка, адныя паэты.

БЕЛАРУС Проста ўсіх мужыкоў ужо адвезлі (*ківае галавой з намёкам на масавыя расстрэлы*), перад паэтамі.

Усе смяюцца.

Я**ЭЙ Заходзяць я**эй, беларус і ўкраінка...

УКРАІНКА Мне больш падабаецца ваш рамантычны настрой.

Я**ЭЙ І вось стаю я ў турэмным калідоры...

Усе смяюцца.

БЕЛАРУС *(Я**эю)* А прачытайце-ка нам што са свайго?

Я**ЭЙ А я цяпер вось і напішу вам што-небудзь.

*Некаторы час едуць моўчкі. Я**эй думае.*

Я**ЭЙ Калі ў полі маіх дзён,
прылягу зманым я ценем
то хай бы па Яго хаценні
я стаў бы ежай для кароў.

УКРАІНКА А вось гэта правільна.

БЕЛАРУС Адзначу, што мне вельмі даспадобы тое, з якой іранічнай лёгкасцю вы спалучаеце гэткі філасофскі дух з духам зямным.

Я**ЭЙ Дзякуй вам, паважаныя спадарожнікі. Я б прапанаваў вам за гэта выпіць хаця б вады, але, вядома...

УКРАІНКА Зберажом.

БЕЛАРУС А ці вядомы нам, у рэшце рэшт, наш канчатковы прыпынак?

Я**ЭЙ У экзістэнцыяльным сэнсе?

УКРАІНКА Мяркуючы па тым, як доўга мы едзем, і па пейзажах, то...

Я**ЭЙ «Широкаа страна моя роднааяя...»

Усе смяюцца

БЕЛАРУС (*да Украінкі*) А вы замужам?

УКРАІНКА А вы з якой мэтай цікавіцеся?

БЕЛАРУС Вядома ж, замужам. Стаўлю на тое, што й за беларусам!

Я**ЭЙ (*да Украінкі*) Што скажаце?

УКРАІНКА Скажу, што чорт яго ведае, як цяпер правільна адказваць.

Усе смяюцца. Некаторы час едуць моўчкі.

УКРАІНКА (*Я**эю)* А вы вось усё пытаеце пра экзістэнцыяльны сэнс. А я вось гэтага не разумею.

Я**ЭЙ Разумееце, экзістэнцыяльнае – гэта ўсё, што тычыцца не столькі пачатковы і канчатковых пунктаў нашага жыццёвага шляху, колькі самога шляху паміж імі. Бо пачатковыя і канчатковыя пункты нам, груба кажучы, вядомыя, а таму не асабліва і цікавыя.

БЕЛАРУС А цікавыя нам свядомыя і несвядомыя рашэнні чалавека, датычныя яго лёсу; рашэнні, якія прымаюцца ўжо без страху смерці альбо ціску грамадскай ганьбы, а выключна чалавекам пра самога сябе. Страшная і моцная свабода…

УКРАІНКА (*задуменна*) Адно пытанне. Адкуль вы такое ведаеце?

БЕЛАРУС (*адначасова*) Мужчынская гімназія.

Я**ЭЙ (*адначасова*) Мужчынская гімназія.

УКРАІНКА (*смяецца*) Усіх мужчын забралі, цяпер ужо нават паэтаў. Наперад, жанчыны!

Я**ЭЙ Да вы таксама, аказваецца, паэтэса!

БЕЛАРУС Альбо замужам за паэтам! Стаўлю, што вы едзеце за каханым у далёкі...

УКРАІНКА Калі я за каханым еду, то гаспадарка тады ж на кім?

Усе смяюцца.

Я**ЭЙ Вязі мяне дарогай вёрткай
буйная чорная машына.
Калі спытае мая Ніна,
скажы, сівы вярнусь ці мёртвы.

Некаторы час едуць моўчкі.

УКРАІНКА Заходзяць я**эй, беларус і ўкраінка да бару...

Усе смяюцца.

БЕЛАРУС Як скончыцца гэта ўсё, паеду...

УКРАІНКА Як скончыцца? Ды што вы...

БЕЛАРУС Як скончыцца (!) гэта ўсё, паеду ў Парыж! Адразу ж! Буду шпацыраваць, удыхаючы веснавое паветра, хадзіць у музеі, у тэатры, размаўляць з людзьмі…

УКРАІНКА (*адначасова*) А я дадому (*усміхаюцца*).

Я**ЭЙ (*адначасова*) А я дадому (*усміхаюцца*).

БЕЛАРУС Што з нашым домам адбылося… І хто ў тым вінаваты.

Я**ЭЙ Палякі.

БЕЛАРУС Чаму палякі?

Я**ЭЙ Усё адно ўва ўсім абвінавацяць палякаў.

БЕЛАРУС А сярод нас тут ніводнага. І дзе ўсе тыя палякі?

УКРАІНКА Хто яго ведае (*разводзіць рукамі з намёкам на масавыя расстрэлы*)

БЕЛАРУС (*Я**эю)* А вы, дарэчы, польскі я**эй, беларускі ці ўкраінскі?

Я**ЭЙ А вы я**эйскі беларус, польскі ці ўкраінскі? Ці, мабыць, рускі?

БЕЛАРУС Чорт яго ведае, як цяпер правільна адказваць.

Я**ЭЙ Ах, як добра, што мы здабылі паняцце нацыі...

Усе смяюцца.

БЕЛАРУС Але ж палякаў шкада. Шкада, што ўва ўсім заўжды вінавацяць палякаў.

Я**ЭЙ Ну, як сказаць ува ўсім і заўсёды...

БЕЛАРУС Вам да іх далёка…

Я**ЭЙ А вам?

УКРАІНКА Дарагія таварышы! Першыя нацыянал-экзістэнцыяльныя гульні абвяшчаюцца распачатымі!

Усе смяюцца.

БЕЛАРУС Але ж не самае належнае выкарыстанне паняцця «экзістэнцыяльны»…

УКРАІНКА Ды мне да сракі.

Усе смяюцца. Некаторы час едуць моўчкі.

Я**ЭЙ Заходзяць я**эй, беларус і ўкраінка да бару, а там ім і кажуць:...

УКРАІНКА (п*ерапыняе*) Расстраляць!

Усе смяюцца.

БЕЛАРУС *(сур'ёзна)* Толькі б лагер.

УКРАІНКА *(сур'ёзна)* Вось гэта б пашанцавала.

Я**ЭЙ *(сур'ёзна)* Усё пашанцавала, што не яма.

УКРАІНКА Ну, не варта аб гэтым тут размаўляць.

БЕЛАРУС А якая розніца? Усё адно гэтага не было. Нічога гэтага ніколі не было.